# ЯК РЫХТУЮЦЦА БІБЛІАТЭКІ.

## Беларуская Дзяржаўная Бібліатэка.

Да сьвяткаваньня 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі Беларуская Дзяржаўная Бібліатэка падрыхтоўвае вялікую кніжную выстаўку на тэму: „10 год савецкага будаўніцтва“.

Паколькі бібліатэка мае ўсе выданьні, якія выходзяць у Савецкім Саюзе, гэта выстаўка высьветліць усебакова ўсе нашы дасягненьні як на культурным, так і на гаспадарчым фронце. Выстаўка будзе адчынена ў чытальнай залі бібліатэкі з 25 кастрычніка да 7-га лістапада. Таксама падрыхтоўваюцца спэцыяльныя аддзелы, прысьвечаныя гісторыі Кастрычнікавай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны і навуковых дасягненьняў СССР за 10 год. Акрамя гэтага, з 15 да 25 кастрычніка ў марксыцкім аддзеле будзе функцыянаваць падрыхтоўчая мэтадычная выстаўка.

## Цэнтральная Пушкінская бібліатэка.

Цэнтральная Пушкінская бібліатэка мяркуе выпусьціць насьценную газэту, прысьвечаную спэцыяльна Кастрычніку з высьвятленьнем дасягненьняў і недахопаў бібліатэкі. У час падрыхтоўкі да сьвята з чытачамі будуць праведзены чыткі на тэму: „Што дала рабочаму і селяніну Кастрычнікавая рэвалюцыя“.

Акрамя гэтага, будзе наладжана кніжная выстаўка, у якую ўвойдзе літаратура па гаспадарчым, каапэрацыйным і культурным будаўніцтве.

У часе сьвята бібліатэка мяркуе правесьці з чытачамі экскурсію ў Дом Чырвонай арміі, Музэй Рэвалюцыі і на заводы.